*Часовы навукова-даследчы калектыў “Нацыянальная школа Беларусі” распрацоўвае канцэпцыю нацыянальнай школы. У аўтарскі калектыў уваходзяць М.А.Гусакоўскі — кандыдат філасофскіх навук (навуковы кіраўнік); І. М. Бабкоў; В. Я. Качаргін — кандыдат філасофскіх навук; Ю. Э. Красноў; Г. М. Кучынскі — доктар псіхалагічных навук; А. А. Палоннікаў; М. С. Сямёнаў — кандыдат філасофскіх навук; П. У. Церашковіч — кандыдат гістарычных навук. Кіраўнік-каардынатар праекта канцэпцыі — А. У. Казулін, кандыдат фізіка-матэматычных навук, намеснік міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь.*

*Прапануем увазе чытачоў часопіса “Адукацыя і выхаванне” тэарэтычныя падставы канцэпцыі. Запрашаем усіх, хто не абыякавы да лёсу нацыянальнай школы і культуры, прыняць удзел у абмеркаванні, спадзеючыся як на развіццё ідэй, што адлюстраваны ў дакуменце, так і на канструктыўную крытыку.*

*Часовы навукова-даследчы калектыў “НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ШКОЛА БЕЛАРУСІ”*

# Тэарэтычныя падставы канцэпцыі нацыянальнай школы Рэспублікі Беларусь*

Агульную сітуацыю, якую мы сёння маем, можна вызначыць наступным чынам. Перад рэспублікай і нацыяй гісторыя паставіла тры запыты.

**Першы** запыт звязаны з задачай нацыянальна-культурнага адраджэння, зваротам да нацыянальна-культурных традыцый, нацыянальнай спадчыны і яе засваення праз сродкі адукацыі на ўсіх яе ступенях; **другі** — з задачай набыцця нацыяй новай прафесійнай кампетэнцыі, бо патрэба ў інтэграцыі ў сусветную супольнасць вымагае іншай, чым цяпер, тэхналагічнай і агульнакультурнай падрыхтоўкі, а значыць, і новых падыходаў да зместу базавай адукацыі; **трэці** — з

* Зацверджаны на пасяджэнні вучонага савета аддзялення тэарэтыка-метадалагічных праблем БелНДІ адукацыі 7 ліпеня 1992 г.

неабходнасцю пераходу да новаї якасці грамадства. Рынак і дэмакратыя патрабуюць умення жыць ва ўмовах аўтаномнага асабістага існавання, не хаваючыся за калектыў, прыняцця на сябе адказнасці за жыццё і лёс сваіх дзяцей, за лёс нацыі.

Усе тры запыты паўстаюць ва ўмовах вострага дэфіцыту рэсурсаў, сацыяльна-палітычнаї нестабільнасці, эканамічнага крызісу. Гэта стварае дадатковыя праблемы (напрыклад, як рэфармаваць адукацыю, не ўзмацняючы нестабільнасць у грамадстве, захоўваючы неабходны ўзровень сацыяльнаї бяспекі, грамадскую згоду і да т.п.).

Пры распрацоўцы падстаў канцэпцыі група зыходзіла з наступнага:

пабудова канцэпцыі нацыянальнаї школы — гэта пошук аднаго з цывілізаваных шляхоў станаўлення нацыянальнаї свядомасці, адраджэння новаї Беларусі. Нацыянальная самасвядомасць — з'ява, якая адлюстроўвае шлях кожнага народа да ўсведамлення сваіх інтарэсаў (сёння яна ператвараецца ў дзейсны фактар самаарганізацыі і адраджэння нацыі). Вось чаму ідэя развіцця і ўмацавання самасвядомасці, самапавагі і нацыянальнаї годнасці ўсведамляецца як адзін з вядучых прынцыпаў сацыяльнаї палітыкі Рэспублікі Беларусь — самастойнаї суверэннаї дзяржавы. Адукацыя можа і павінна зрабіцца неад'емным кампанентам кансалідацыі і развіцця нацыі;

сістэма адукацыі, якую мы маем сёння (перш за ўсё сярэдняя школа), узнікла і існавала як уніфікаваная, стандартызаваная і кіруемая з цэнтра. Цэнтралізацыя кіравання народнаї адукацыяї дала дзяржаве магутны інструмент для рэалізацыі пэўнаї нацыянальна-палітычнаї мэты — фарміравання "новаї сацыяльнаї і гістарычнаї супольнасці". Разглядаючы савецкі народ як нацыянальнае адзінства, гэта ўстаноўка была, па сутнасці, мадыфікацыяї старої ідэі паскарэння "інтэрнацыяналізацыі" — пераадолення нацыянальных адрозненняў і стварэння нацыянальна гамагеннага грамадства. Адным з накірункаў яе ажыццяўлення была унітарызацыя школы, арыентаваная на палітызаваны "агульнасавецкі" змест. Школа, выключаная з сістэмы нацыянальнаї культуры, скіроўвалася на абслугоўванне не столькі этнасу і нацыі, колькі таго вялікага маргіналізаванага слою насельніцтва, што ўзнік у выніку масавых сацыяльных і нацыянальных зрухаў. Адарванасць ад нацыянальных патрэбаў, дысгармонія паміж канкрэтным нацыянальным ідэалам выхавання і аднабаковым сацыяльным стэрэатыпам, што рэалізоўваўся ва ўстановах адукацыі, прывялі да збяднення ў моладзі эмацыянальнаї сферы, да маральнага рэлятывізму. Пры ўдзеле школы, адлучанаї ад нацыянальнаї культуры, выраслі пакаленні людзей "без роду і племені", не абцяжараных аніякаї адказнасцю. Таму толькі на аснове вяртання ўсёї сістэмы адукацыі на глебу нацыянальнаї культуры і яе мясцовых субкультур можа быць узведзены будынак асабістаї і агульначалавечаї культуры;

працэс нацыянальнага адраджэння мы разумеем як выяўленне асновы, на якої грунтаваліся б адносіны да свету, як рэкультывацыю тых духоўных крыніц, з якіх можна чэрпаць сілы для сённяшняга і будучага развіцця. Гэта не рэанімацыя каштоўнасцей, ісцін, стандартаў і правілаў, якія адмерлі, а сродак, што забяспечвае ўваход у сусветную цывілізацыю і культуру;

разам з неабходнасцю адраджэння нацыянальнаї самасвядомасці перад нацыяї паўстае праблема пераходу да іншага тыпу сацыяльнага развіцця, да больш высокага ўзроўню цывілізаванага грамадства. Пры гэтым школе належыць фарміраваць новы тып асобы грамадзяніна і працаўніка, які валодае новым, якасна іншым, зместам кампетэнтнасці. Гаворка ідзе аб асобе, што здольная жыць ва ўмовах дэмакратычнага грамадства, развіцця рынку, новых, больш высокіх, тэхналогій, іншых сацыяльных структур — г. зн. у грамадстве з непрадвызначанаї будучыняї, — а таму ёї належыць быць падрыхтаванаї да жыцця ва ўмовах свабоды. Без дастаткова радыкальнаї перабудовы зместу адукацыі ажыццявіць гэта немагчыма;

практыка цяперашняї школы, колькі б мы яе ні паляпшалі, не ў стане забяс-

печыць такую якасць адукацыі, як здольнасць да адэкватнага адказу на ўсе новыя запыты развіцця. Патрабуецца карэннае змяненне ўсёй адукацыйнай сістэмы. Тут магчымыя два прынцыповыя выйсці. Першае — запазычыць новыя адукацыйныя тэхналогіі, распрацаваныя ў больш развітых краінах, і перанесці іх на мясцовую глебу, прыстасаваўшы да нашых умоў. Другое — з улікам замежнага вопыту распрацаваць сваю мадэль адукацыі, што максімальна зыходзіла б са спецыфікі сітуацыі, у якой апынулася нацыя, каб пабудаваць уласную нацыянальную сістэму адукацыі на ўзроўні лепшых замежных узораў. Мы аддаём перавагу другому шляху. Аднак, відавочна, ён запатрабуе большых матэрыяльных сродкаў і духоўных намаганняў у параўнанні з першым. Спецыфіка такога падыходу ў тым, што пры яго ажыццяўленні ўзнікненне новага ўзору нацыянальнай школы магчымае толькі як сінтэз (спалучэнне) адноўленай традыцыі адукацыі, уласцівай беларускаму народу, і ідэальных мадэлей, якія ствараюцца на аснове тэарэтычнага развіцця ў сферы педагагічнай думкі, наватарскіх педагагічных ідэй і г.д.;

мы схільныя разглядаць адукацыю не як "другасны" інстытут, што закліканы забяспечыць патрэбы іншых сацыяльных утварэнняў, а як адносна самастойную сістэму, здольную ў цяперашніх умовах, пры наяўнасці адпаведнай палітыкі, надаць імпульс, паскорыць развіццё рэгіёна, зрушыць грамадства наперад, паспрыяць кансалідацыі нацыі;

пры распрацоўцы канцэпцыі ажыццяўляўся культуралагічны падыход. Ён вымагае, каб у аснову зместу адукацыі быў пакладзены цэласны культурны вопыт чалавецтва: маральны, рэлігійны, філасофскі, эстэтычны, тэхнічны і да т.п. у дадатак да вопыту навуковага пазнання свету. Менавіта такі падыход дазваляе, на нашу думку, распрацоўваць тэму нацыянальнай школы Беларусі найбольш адэкватнымі сродкамі і таму выкарыстоўваецца намі як сістэмаўтваральны ў адносінах да ўсіх іншых дысцыплінарных падыходаў (філасофскага, псіхалагічнага, сацыялагічнага, педагагічнага і г.д.).

**Укараненне індывіда ў яго родную культуру складае асноўную задачу нацыянальнай школы.**

## I. Ці ёсць крызіс у адукацыі?

Існуе пункт гледжання, паводле якога ў сферы адукацыі крызісу няма, бо яе функцыяніраванне адносна стабільнае, да таго ж, як сведчаць вынікі міжнародных апытанняў, Рэспубліка Беларусь знаходзіцца далёка не на апошнім месцы па ўзроўні адукаванасці сярод развітых краін. Прычыны ж наяўных цяжкасцей — у недастатковым фінансаванні, састарэлых падручніках і метадычных рэкамендацыях, невысокай заработнай плаце настаўнікаў і ў зніжэнні прэстыжу іх працы і самой сістэмы адукацыі як сферы чалавечай дзейнасці.

Разам з тым вынікі праведзеных у апошнія гады сацыялагічных апытанняў сведчаць аб незадаволенасці шырокіх слаёў грамадства станам сучаснай адукацыі. Так, больш за 70% настаўнікаў лічаць, што школа знаходзіцца ў глыбокім крызісе і патрабуе карэннай перабудовы. Каля 1/3 апытаных бацькоў не задаволены школай. Практычна кожны сутыкаўся ў свой час са скаргамі дзяцей на сум і аднастайнасць школьнага жыцця, канфлікты з настаўнікамі і аднакласнікамі. Педагагічная перыёдыка на працягу амаль 7 гадоў абмяркоўвае "заганы", якія з'яўляюцца сведчаннем такіх крызісных працэсаў, як "згасанне" асобы ў час навучання, прыярытэт традыцыйных формаў адукацыі ў адносінах да новага педагагічнага зместу, непрыманне навацый, адчужэнне вучняў ад ведаў, настаўнікаў — ад школы, перагружанасць навучальных планаў, узрастаючае адставанне зместу школьнай адукацыі ад навукі, агульнае падзенне прэстыжу ведаў і адукаванасці ў грамадстве. Калі коратка сфармуляваць праблему, то яна зводзіцца да таго, што крызіс у адукацыі, які мы назіраем сёння, — гэта ўвасабленне неадпаведнасці існуючай сістэмы новай сацыякультурнай, палітычнай і экана-

мічнаї сітуацыі. Таму зразумець сапраўдныя яго прычыны немагчыма па-за аналізам тых змен і тэндэнцыйі сацыяльнага развіцця, што маюць месца ў Рэспубліцы Беларусь. Яскравае ўяўленне аб гэтых зменах і тэндэнцыях дазволіць ажыццявіць больш дакладны крытэрыяльны аналіз функцыяніравання сістэмы адукацыі.

## II. Аналіз сацыякультурнай сітуацыі

Аналіз сацыякультурнаї сітуацыі і рэгіянальных тэндэнцый палітыка-эканамічнага развіцця абапіраецца на распаўсюджаную сёння ў сучаснай сацыялогіі мадэль грамадскага развіцця, якая выкарыстоўвае паняцці традыцыйнага, індустрыяльнага і постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадстваў.

**Традыцыйнае грамадства** характарызуецца такімі асноўнымі ўласцівасцямі, як аграрна-рамесніцкая вытворчасць, абшчынна-саслоўная структура, адсутнасць аўтаноміі асобы і ідэі правоў чалавека, а таксама каштоўнасцю прынцыпу "нядзеяння" (неўмяшання ў жыццё прыроды), інерцыйнасцю аднойчы прынятых нормаў жыцця.

**Індустрыяльнае грамадства** грунтуецца на машыннай вытворчасці, фабрычнай арганізацыі і дысцыпліне працы, нацыянальнай сістэме гаспадаркі са свабодным гандлем і агульным рынкам. Аснову яго сацыяльнай арганізацыі складае ўсеагульны абмен вынікамі дзейнасці, што набываюць форму тавару. Тып асобы засноўваецца на службовай дысцыпліне і дзелавой прафесійнай кампетэнтнасці. Каштоўнасцямі робяцца навацыя, аўтаномія і ініцыятыва асобы, навуковая рацыянальнасць, пераўтваральныя (пануючыя) адносіны да свету (прыроды і грамадства).

**Постіндустрыяльнае (інфармацыйнае) грамадства** грунтуецца на інфармацыйных тэхналогіях; вытворчасць робіцца навукаарыентаванай, рабатызаванай і аўтаматызаванай. Развіваецца сфера камунікацый і паслуг, у якой занята большасць працаздольнага насельніцтва. Пашыраецца сфера зносін людзей пры дапамозе камп'ютэрных сетак. Прыярытэт набываюць такія каштоўнасці, як індывідуалізацыя і самарэалізацыя асобы і зніТаванасць з прыродай.

Другой тэарэтычнай пасылкай, з дапамогай якой магчыма аналізаваць сацыякультурную сітуацыю, з'яўляецца падзел грамадстваў на **традыцыйныя і дынамічныя. Традыцыйным** называюць грамадства, у якім асноўным з'яўляецца працэс узнаўлення дзейнасці, сацыяльных структур, жыццёвага ўкладу і традыцый. Галоўнае адрозненне **дынамічнага** грамадства ад традыцыйнага ў тым, што асноўным працэсам у ім з'яўляецца не узнаўленне, а развіццё, змяненне дзейнасці і сацыяльных структур, адпаведных ім формаў і маральных нормаў. Будучае такога грамадства не можа быць тоесным яго мінуламу.

Абапіраючыся на ўведзеныя адрозненні тыпаў грамадства, асноўную тэндэнцыю грамадскага развіцця Рэспублікі Беларусь можна назваць такім тэрмінам сучаснай сацыялогіі, як "**мадэрнізацыя**". Яе мы разумеем як працэс пераходу ад стабільнага, традыцыйнага, да сучаснага, індустрыяльнага, дынамічнага грамадства, якое ўвесь час мяняе свае асновы. Маецца на ўвазе ўвядзенне новых навукаёмістых тэхналогій, што выклікаюць, у сваю чаргу, тэхнічнае, сацыяльнае і культурнае пераўтварэнні грамадства. Канчатковым вынікам мадэрнізацыі для нашай краіны можа стаць грамадства, аснову якога складае свабода гаспадарання і думкі. Адным з вядучых працэсаў у мадэрнізацыі грамадства з'яўляецца пераарыентацыя сацыяльнага ідэалу людзей з грамадска-калектывісцкай мадэлі на індывідуальна-асобасную; істотным робіцца паняцце прыватнага жыцця, якое азначае суверэнітэт жыцця духоўнага, міжасобасных зносін, сферы сямейнага і асабістага спажывання, права распараджацца сваёй маёмасцю.

Змены ў сацыякультурнай сітуацыі рэспублікі ў значнай ступені звязаны з разбурэннем савецкай таталітарнай грамадскай сістэмы, абвяшчэннем суверэнітэту (незалежнасці), арыентацыяй на інтэграцыю ў сусветную супольнасць і раз-

віццё рыначных формаў гаспадарання, а ў сацыяльна-палітычнай сферы — на пабудову дэмакратычнай (прававой) дзяржавы.

Па сутнасці, мы ўвайшлі ў посткамуністычную эпоху: замест грамадзянскай супольнасці маем фетыш дзяржавы, якая адна выказвае агульны інтарэс. Мы пабудавалі індустрыю, практычна поўнасцю падпарадкаваную ваеннаму комплексу — яна здольная толькі "паглынаць" рэсурсы, але не задавальняць надзённыя патрэбы людзей, — і эканоміку, уключаную ў народнагаспадарчы комплекс былога СССР, якая не ў стане канкурыраваць з развітымі краінамі.

Таму перад усімі намі паўстае задача стварэння сапраўднай індустрыі і ўваходжання ў стадыю індустрыяльнага грамадства (многія іншыя краіны і народы яе ўжо прайшлі). **Адукацыя ў такіх умовах можа ажыццяўляць перавод каштоўнасцей традыцыйнай культуры ў каштоўнасці культуры індустрыяльнай.**

Такім чынам, працэс мадэрнізацыі ў рэспубліцы адбываецца ва ўмовах існавання посттаталітарных, посткамуністычных сацыяльных структур і адпаведных ім формаў паводзін, мыслення і свядомасці, што надае сваю спецыфіку функцыяніраванню рынку, дэмакратычных інстытутаў і інш. Гэтага нельга не ўлічваць пры правядзенні розных сацыяльных рэформаў, у тым ліку і ў сферы адукацыі.

Разам з тым для рэгіёна Рэспублікі Беларусь можа з'явіцца цікавым досвед усходняга шляху мадэрнізацыі (Японія, Паўднёвая Карэя, Тайвань). Яна ажыццяўлялася без індывідуалізацыі заходняга тыпу, нават пры ўзмацненні традыцыйнай мадэлі культуры, што прывяло да фарміравання ў гэтых краінах асаблівага тыпу грамадства — "камунальнага капіталізму".

Зыходзячы з зазначанага, істотным аспектам аналізу сацыякультурнай сітуацыі павінны зрабіцца вызначэнне мэтаў і перспектыў грамадскага развіцця, напаўненне паняццяў незалежнасці і суверэнітэту рэальным зместам, выпрацоўка прынцыпова новай сацыяльна-эканамічнай палітыкі, зарыентаванай на ўласныя сілы і сродкі. Гэта шмат у чым вызначае палітыку ў сферы нацыянальнай адукацыі.

## III. Адукацыя ў перыяд мадэрнізацыі

Дадзім кароткую характарыстыку сацыякультурнай сітуацыі ў адукацыі.

Сёння ў школах рэспублікі атрымалі шырокае распаўсюджанне наступныя з'явы: дыдактызм (урок як галоўная каштоўнасць педагагічнага працэсу), прадметацэнтрызм (навучальны прадмет як самакаштоўнасць безадносна да развіцця асобы дзіцяці), навучанне на шкоду выхаванню, прафадбор і прафпадрыхтоўка на шкоду маральнаму і духоўнаму развіццю асобы. Сама арганізацыя навучальнага працэсу (у рэальнасці, а не на словах) фарміруе адметны тып чалавека, успрымальнага да стэрэатыпаў і ладу жыцця таталітарнага грамадства (аўтарытарызм педагагічнай работы); іх аснову складаюць імкненне да уніфікацыі і стандартызацыі, стаўленне да дзіцяці як да непаўнацэннага дарослага (адмаўленне самакаштоўнасці дзяцінства).

У дадатак да гэтага сучасная школа Беларусі ўвабрала ўсе рысы і недахопы савецкай школы. Адукацыя ў ёй, па сутнасці, безнацыянальная. Адзначым, што апошнім часам прадпрымаўся і прадпрымаецца шэраг захадаў па паляпшэнні сістэмы адукацыі: інтэлектуалізацыя (культываванне інтэлекту нацыі), дыферэнцыяцыя (селекцыя дзяцей па фармальных выніках так званай псіхалагічнай дыягностыкі), рэалізацыя ідэалогіі бесперапыннай адукацыі, зразуметай як пажыццёва ўзнаўляемае навучанне ў межах своеасаблівай педагагічнай дзейнасці. У канчатковым выніку рэфарматарства на дзяржаўным узроўні, як і педагагічнае наватарства, пакуль застаюцца ў палоне тых поглядаў і практыкі, якія не паляпшаюць, а ўскладняюць становішча.

Сістэма школьных дысцыплін застыла ў стэрэатыпах карціны свету XIX ст., хоць навука нашага часу кардынальна змянілася. Сучасную навуковую свядомасць можна азначыць як постнекласічны рацыяналізм, у адрозненне ад не-

класічнага і класічнага. Інстытут адукацыі ўзнаўляе толькі апошні. Новая навуковая рацыянальнасць характарызуецца сацыякультурнай абумоўленасцю навуковых ведаў, шматзначна-верагоднасным дэтэрмінізмам, уключанасцю ў навуковыя веды суб'екта стварэння, яго этычнай адказнасцю за лёс свету і культуры. Увогуле можна сказаць: адукацыя ў рэспубліцы пабудавана па дагматычна-традыцыйным тыпе, што ўваходзіць у супярэчнасць з працэсамі змянення і развіцця, уласцівымі індустрыяльнаму дынамічнаму грамадству.

Працэс мадэрнізацыі вылучае прынцыпова новыя патрабаванні да адукацыйных сістэм: апошнія не могуць больш адназначна нацэльвацца на трансляцыю ўзораў культуры мінулага (у тым ліку і інтэрнацыянальна-савецкай), якія дэзарыентуюць моладзь ва ўмовах зменлівага сацыяльнага і міжнацыянальнага жыцця. Чалавек, які жыве ў дынамічным індустрыяльным грамадстве, павінен мець здольнасці да разумення унікальных сацыяльных і міжнацыянальных сітуацый, да іх рэфлексіўнага асваення, самавызначэння і самаарганізацыі ў новых, неўнармаваных мінулай культурай, умовах. Гэта патрабуе распрацоўкі іншага, адрознага ад традыцыйна-дагматычнага, падыходу да адукацыі і выхавання, які можа быць названы рэфлектыўна-сітуацыйным.

Мэта адукацыі ўскладняецца. З аднаго боку, застаецца традыцыйная задача падключэння індывіда да сукупнага чалавечага вопыту, зафіксаванага ў культурных нормах, "укаранення" падрастаючых пакаленняў у гісторыю і культуру, а з другога — узнікае новая: падрыхтоўка да няпэўнай будучыні праз развіццё такіх універсальных здольнасцей асобы, як мысленне, рэфлексія, дыялагічныя зносіны і разуменне, творчасць і г.д. Культура тады "бярэцца" як вопыт, а не як прыклад для пераймання. У гэтым сэнсе развіццё з'яўляецца пераадоленнем ("зняццем") старых і нараджэннем новых формаў.

Разам з тым аб'ектыўна ўласцівае мадэрнізацыі памяншэнне значэння і аўтарытэту мінулай традыцыі і культуры ў рэальным жыцці выклікала шмат тэндэнцый, якія спарадзілі глабальную праблему разрыву сучаснага чалавека з "целам" і вопытам мінулага жыцця і культуры. У выніку паглыбіўся крызіс сацыялізацыі, які выяўляецца ў павелічэнні разрыву паміж пакаленнямі, мінімізацыі выхаваўчай ролі сям'і, рэлігіі, дзяржавы, узмацненні маргінальнасці існавання і дэвіянтнасці паводзін індывіда. Змена тыпу сацыякультурнага наследавання не азначае адмаўлення ад папярэдняй культуры, негатыўнага стаўлення да мінулага вопыту. У гэтым выпадку змест культуры, прызначаны для трансляцыі праз інстытут адукацыі, пачынае вызначацца не звычайным працягам традыцыі продкаў (па прынцыпе ўзнаўлення ўсіх асаблівасцей іх жыццядзейнасці), а, з аднаго боку, каштоўнасцямі, якія вызначаюць праграмы будаўніцтва новых сацыякультурных структур і сфер дзейнасці, з другога — універсальнасцю і важкасцю культурных сродкаў, якія выбіраюцца і ёсць у наяўнасці. **Па сутнасці, сёння мы адзначаем, што рэспубліка ў сваім развіцці ажыццяўляе агульнацывілізацыйны паварот ад традыцыйна-індустрыяльнага да індустрыяльна-дынамічнага, ад таталітарна-камуністычнага да дэмакратычнага посткамуністычнага грамадства.** Прынцыповым для адукацыі вынікам гэтага зрабілася змяненне тыпу сацыякультурнага наследавання: мінулае ўсё менш вызначае сучаснае і будучае. Набывае асаблівую важкасць падрыхтоўка новых пакаленняў да жыцця ва ўмовах непрадвызначанасці і няпэўнай будучыні.

Другім вынікам цывілізацыйнага павароту з'яўляюцца неабходнасць прынцыповай пераарыентацыі адукацыі, перамяшчэння цэнтра ўвагі ў яе палітыцы з калектывізму да індывідуалізму як прынцыпу арганізацыі сацыяльнага жыцця і асабістых паводзін, а таксама пошук новых формаў індывідуальна-асобаснага існавання дзіцяці ў калектыве (нетрадыцыйнае разуменне калектыўнасці).

Новая каштоўнасць прыватнага жыцця асобы вядзе за сабой пэўную сістэму табу, забаронаў на ўмяшанне настаўніка ў асабістае жыццё вучня і яго бацькоў.

Цывілізацыйны зрух зноў (каторы ўжо раз!) ставіць нас перад выбарам: удасканальваць існуючую сістэму адукацыі або прынцыпова яе змяняць шляхам

лібералізацыі і кардынальнага рэфармавання. Патрэба ў глыбіні і маштабнасці змен схіляе да перавагі ў бок апошняга.

Карэннае і прынцыповае рэфармаванне адукацыі патрабуе сур'ёзнай канцэптуальнай работы, аналізу вялікага комплексу праблем, у лік якіх уваходзяць тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і сацыякультурнага развіцця рэгіёна; выбар прыярытэтных мэтаў і каштоўнасцей; пошук новага ўзору сістэмы адукацыі; адбор новага зместу і стварэнне адпаведных яму педагагічных тэхналогіі, прыдатных для вырашэння новых задач. Тэарэтычная распрацоўка гэтага кола праблем павінна папярэднічаць такім прадметна-тэхналагічным этапам, як стварэнне мадэлі школы, канструяванне навучальнага плана і праграм, мадэліраванне кіравання адукацыяй, мадыфікацыя адукацыйных паслуг ва ўмовах рынку. У сукупнасці дадзены комплекс і павінен скласці змест перспектыўнага праекта канцэпцыі нацыянальнай школы Рэспублікі Беларусь. Праектаванне, падобнае да гэтага, — справа складаная з прычыны адсутнасці ў рэспубліцы вопыту адпаведнай работы, а таксама з-за неабходнасці сінтэзаваць у межах адной мадэлі канцэптуальныя навацыі шэрага навуковых дысцыплін: педагогікі, псіхалогіі, культуралогіі, філасофіі, метадалогіі, сацыялогіі і г.д.

## IV. Стратэгічныя мэты і задачы адукацыі

Зыходзячы з аналізу тэндэнцыі грамадскага развіцця ў рэспубліцы і сацыякультурнай сітуацыі ў адукацыі, лічым, што можна вылучыць наступныя стратэгічныя каштоўнасныя арыентацыі нацыі, якія перафармулёўваюцца ў наступныя функцыянальныя мэты і задачы адукацыйнай сістэмы:

**каштоўнасць этнакультурнай ідэнтыфікацыі** беларусаў са сваімі народам і культурай з мэтай пераходу ад савецкай "інтэрнацыянальнай" школы, што прыгнятала нацыянальныя культуры, да беларускай нацыянальнай;

**каштоўнасць грамадзянскай супольнасці**, якая мае на мэце падрыхтоўку чалавека да ўмоў жыцця ў грамадстве, дзе прыярытэт пераносіцца з дзяржаўна-калектыўных інтарэсаў на аўтаномію, свабоду і прыватнае жыццё грамадзян;

**каштоўнасць развіцця асобы**, скіраваную на замену ідэалогіі падрыхтоўкі кадраў для вытворчасці ідэямі цэласнага развіцця розных чалавечых здольнасцей, што не задаецца настаўнікам (прынцып фарміравання), а абапіраецца на логіку ўласнай дынамікі развіцця выхаванца (прынцып "ад дзіцяці").

Улічваючы асаблівую важнасць першай з вызначаных каштоўнасцей, спынімся на ёй больш падрабязна. Пачнём з праблемы крызісу беларускай нацыянальнай самасвядомасці і беларускай ідэнтычнасці. Памянёны феномен выяўляецца перш за ўсё ў нацыянальна-культурным нігілізме, страце гістарычнай памяці, адрыве ад народных традыцый, недастатковай распаўсюджанасці беларускай мовы. Вырашэнне гэтай фундаментальнай для Беларусі задачы не можа адбывацца толькі за кошт перакладу зместу навучальных прадметаў з рускай мовы на беларускую.

Уяўляецца мэтазгодным больш дакладна акрэсліць паняцце беларускасці. Калі раней тут мелі на ўвазе этнакультуру беларусаў, то ў сучасным, шырокім, сэнсе беларуская культура паўстае як надэтнічны феномен, які арганічна ўвабраў у сябе набыткі ўсіх народаў, якія жылі на тэрыторыі рэспублікі (рускія, літоўцы, палякі і г.д. былі гістарычна ўключаны ў беларускую культурную традыцыю).

Неабходна прадугледзець такія формы жыццядзейнасці і зносін вучняў, дзякуючы якім можна было б "наладзіць сустрэчу" беларусаў з іх нацыянальнай культурай як з роднай, а іншых нацыянальных меншасцей — з уласнай традыцыяй у рамках беларускай гісторыі і культуры.

Для рэалізацыі гэтай ідэі неабходна вырашыць як мінімум дзве задачы: філасофска-метадалагічную рэканструкцыю беларускай культуры, вытокаў яе міфаў, механізмаў яе станаўлення і развіцця (распрацоўка беларускай культуралогіі) і праектаванне спецыяльнага псіхолага-педагагічнага механізма ўвядзення бела-

рускага матэрыялу ў кантэкст жыццядзейнасці падрастаючых пакаленняў (распрацоўка механізмаў этнакультурнай ідэнтыфікацыі)*

У спецыяльнай літаратуры найбольш распрацаваны аспект сацыяльна-псіхалагічнай ідэнтыфікацыі, які звязаны з атаясамліваннем індывіда з іншым чалавекам. Таму ўяўляецца мэтазгоднай навукова-тэарэтычная распрацоўка этнакультурнага аспекту ідэнтыфікацыі, які варта разумець як ідэнтыфікацыю сябе з культурай.

## V. Філасофія адукацыі і новая педагагічная ідэалогія

Разгледзім некаторыя новыя тэндэнцыі ў галіне светапогляду, што выклікаюць змены і ў сферы філасофіі адукацыі. Ідэі плюралізму і дыялогу робяцца вядучымі і вызначальнымі ў многіх сферах сацыяльнага быцця: міжасобасных зносінах (філасофія і псіхалогія дыялогу), сацыяльным узаемадзеянні (дыялог культур), узаемаадносінах з ачалавечанай прыродай (ідэя ноасферы, або інжынерна-прыродна-чалавечых комплексаў, у якія чалавек арганічна ўключаны). Усё гэта накладвае на дзейнасць чалавека мноства забаронаў і абмежаванняў і патрабуе рэалізацыі асаблівай стратэгіі і этыкі негвалтоўнасці.

Акрамя таго, сучасная філасофія адзначае факт некаторай вычарпанасці навукі як патэнцыяльнай асновы светапогляднага сінтэзу. Сёння няма пераканаўчых абгрунтаванняў для перавагі навуковай рацыянальнасці над іншымі спосабамі духоўнага асваення рэчаіснасці: звычайнай свядомасцю і здаровым сэнсам, міфам, рэлігіяй, мастацтвам. Для адукацыі асабліва важнымі робяцца гуманізацыя навучання, адмаўленне ад гатовых ведаў, фарміраванне ў настаўніка ўмення ўваісці ў дыялог, не парушаючы свету дзіцячай культуры, этыка негвалтоўнасці. Варта культываваць так званыя дасведчаную няведу і вучонае няздание, што азначае веданне чалавекам межаў сваіх ведаў — таго, што канкрэтна патрабуе пазнання, высвятлення і разумення. У выніку адукацыя набывае такі вобраз, якому ўласцівыя змена тыпаў рацыянальнасці, разнастайная арганізацыя ведаў і механізмаў самафарміравання культурных феноменаў дзіцем.

Новая філасофія адукацыі выклікае да жыцця і адпаведную ёй педагагічную ідэалогію. Увогуле новую парадыгму педагогікі можна было б сфармуляваць наступным чынам: на працэс адукацыі трэба глядзець зыходзячы не з таго, што мы хочам транслiраваць, знаходзячыся ў традыцыйным прадметным змесце, а з таго, што вучню неабходна на пэўным этапе яго развіцця для сённяшняга жыцця, з аднаго боку, і жыцця ва ўмовах няпэўнага будучага — з другога.

Такую педагогіку можна назваць **дзетаарыентаванай, педагогікай самаразвіцця асобы**, а педагагічнае мысленне ахарактарызаваць як такое, што ідзе ад дзіцяці ("мысліць ад чалавека", адказваць на пытанні: "Што я магу зрабіць для развіцця дзіцяці?", "Чым я магу ў гэтым яму дапамагчы?" і г.д.). Да таго ж неабходна адмовіцца ад дэміургічнай устаноўкі псіхолага-педагагічнай навукі на адзіна навуковае (і ў гэтым сэнсе "правільнае") веданне аб чалавеку і значыць — ад жорсткага вызначэння межаў чалавечага развіцця. **Чалавек ёсць бясконцая магчымасць.** Педагогіка павінна вучыцца дапамагаць людзям свае магчы-

---

* Пад ідэнтыфікацыяй разумеюць працэс прыпадабнення сябе да іншай асобы і атаясамлівання сябе з ёю, а этнакультурная ідэнтыфікацыя трактуецца як шэраг актаў самаатаясамлівання і самастварэння, звязаных з "прысваеннем" каштоўнасцей, ідэалаў, нормаў паводзін, уласцівых пэўнай культуры, носьбітам якой з'яўляецца настаўнік (яго асоба).

масці ацэньваць і ажыццяўляць, што патрабуе іншых (дыялагічных) стаўлення і зносін, а таксама прынцыпова іншых педагагічных формаў і тэхналогіі.

## VI. Магчымая мадэль нацыянальнай школы Беларусі

Урэшце, дадзім агульны абрыс адной з магчымых мадэлей нацыянальнаі школы Беларусі. Пад нацыянальнаі школаі трэба разумець сістэму адукацыі дзяцей і падлеткаў, якая будуецца на прынцыпе ўключэння іх у родную этнакультурную традыцыю з мэтаі адраджэння нацыянальнаі культуры, станаўлення новых пакаленняў яе носьбітаў і творчых прадаўжальнікаў на аснове паўнацэннага валодання роднаі моваі. Гэта школа павінна забяспечыць таксама ўключанасць дзіцяці ў кантэкст развіцця сусветнаі культуры. Прапанаваная мадэль мае папярэдні характар.

Агульнаадукацыйная масавая школа складаецца з трох модуляў (ступенеі):

1 — пачатковага (падрыхтоўчага);

2 — базавага (агульнаі падрыхтоўкі);

3 — спецыялізацыйнага.

Прапануецца адпаведнае перафункцыяніраванне модуляў (ступенеі). Калі цяпер пачатковая адукацыя скіравана на навучанне чытанню, пісьму, ліку (элементарнаі граматнасці), то ў новаі школы іншая задача: фарміраванне асобы вучня як суб'екта будучаі навучальнаі дзейнасці. Другая задача — першасная этнакультурная ідэнтыфікацыя.

У аснове **першага модуля** — актуалізацыя слоя базавых этнакультурных структур. Агульнапрынятая ў фалькларыстыцы і этнаграфіі класіфікацыя ўключае 18 феноменаў, якія можна аднесці да першаснага культурнага базісу народа. Гэта народныя прыкметы, варажба, прадказанні, забабоны, пластыка цела, танец, семіятычныя абрады, гульні, меры вагі, даўжыні і да т.п., сістэмы загадаў, каманд і г.д., калі дзіця ўпершыню сутыкаецца з чатырма класамі з'яў — артэфактаў нацыянальнаі культуры — з рэчамі, тэкстамі, асобаі, сацыяльным інстытутам.

**Другі модуль** — акадэмічны. Яго змест складаюць асновы культуры (уключаючы навуку), а галоўныя задачы — навучанне мысленню, фарміраванне сучаснага тыпу рацыянальнасці (некласічнаі) і другасная этнакультурная ідэнтыфікацыя асобы. Асаблівасцю гэтага модуля павінна з'явіцца, па-першае, значнае скарачэнне колькасці навучальных прадметаў за кошт інтэграцыі сённяшніх курсаў. (Напрыклад, у школах заўтрашняга дня ЗША ўсяго пяць базавых прадметаў: матэматыка, англійская мова, прыродазнаўчыя і гуманітарныя навукі, "словаўтварэнне" — на 12 гадоў навучання.) Па-другое, навучанне ў гэтым модулі мэтазгодна максімальна індывідуалізаваць, каб кожны вучань атрымаў магчымасць рухацца па сваёй траекторыі ў вывучэнні асобных навук. Прыкладам такоі арганізацыі навучальнага працэсу могуць паслужыць таксама прынцыпы школ заўтрашняга дня.

Працэс нацыянальнаі ідэнтыфікацыі ў гэтым модулі можа быць арганізаваны вакол асваення мадэлі нацыянальнаі ментальнасці, у якоі можна вылучыць такія кампаненты, як нацыянальны космас, нацыянальны логас, нацыянальная псіхея.

На жаль, работа па тыпалагізацыі і катэгарызацыі беларускаі ментальнасці толькі пачалася. (Яе вядзе група культуролагаў ЧНДК "Нацыянальная школа Беларусі", у якую ўваходзяць супрацоўнікі Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны; кіраўнік — І. М. Бабкоў.)

**Трэці модуль** — спецыялізацыя. На нашу думку, зыходзячы з рэальнага становішча ў рэспубліцы, асноўныя спецыялізацыі мэтазгодна сістэматызаваць наступным чынам:

**гуманітарныя** (акцэнт на гуманітарнае развіццё асобы і падрыхтоўку гуманітарнай інтэлігенцыі);

**прыродазнаўчанавуковыя** (падрыхтоўка кадраў для навукі і вытворчасці);

**дзелавыя** (падрыхтоўка палітыкаў, прававедаў, менеджэраў, кіраўнікоў, прадпрымальнікаў, бізнесменаў);

**пазавытворчыя** (падрыхтоўка работнікаў невытворчай сферы).

У трэцім модулі на першым этапе з-за недахопу сродкаў мэтазгодна вылучыць элітарныя школы па ўсіх трох блоках з прыярытэтным фінансаваннем для якаснай падрыхтоўкі нацыянальных інтэлігенцыі, кадраў для навукі, культуры і палітыкі, а таксама нацыянальна арыентаваных дзелавых слаёў. У якасці магчымай мадэлі гуманітарнага блока можна разглядаць ліцэй беларускага адукацыйна-культурнага цэнтра (г. Мінск) з яго філіяламі ў абласцях.

Нацыянальная ідэнтыфікацыя на трэцім этапе можа ажыццяўляцца праз блок дысцыплін, якія вызначаюць месца беларускай культуры і нацыі ў кантэксце сусветнай цывілізацыі. Вырашальная роля тут належыць гісторыі беларускай думкі, а таксама курсам, здольным сістэматызаваць веды і пабудаваць агульную карціну свету (курсы гісторыі сусветных філасофіі, рэлігіі, культуры, цывілізацый і да т.п.)

З улікам умоў спецыялізацыі лічым мэтазгодным дыферэнцыраваць і асноўны метад выкладання. У першым блоку ім можа быць герменеўтыка, у аснове якой — работа з неадаптаванымі тэкстамі, з арыгінальнымі ўзорамі культуры. Другі блок можа быць пабудаваны па метаду навукова-тэарэтычнага дыскурса. Вядучым метадам у трэцім блоку выкладання можа выступіць мыслядзейнасны (ён распрацоўваецца, у прыватнасці, у сістэмамыслядзейнаснай метадалогіі), а агульным спосабам арганізацыі ведаў — постнекласічны тып рацыянальнасці, які распрацоўваецца ў культуры інфармацыйнага грамадства.

У межах дадзенага модуля, магчыма, мае сэнс ажыццявіць больш вузкую спецыялізацыю і па прыкладу Францыі ўвесці адпаведны бакалаўрыят. Гэта дазволіць кожнаму, хто пажадае, пасля адпаведнай падрыхтоўкі і здачы экзаменаў атрымаць адпаведны "бак", а значыць, і права працаваць у адпаведнай сферы.

Акрамя названых формаў агульнай дзяржаўнай адукацыі, з мэтай стымулявання пошуку новых адукацыйных формаў неабходна стымуляваць з'яўленне ў рэспубліцы сістэмы альтэрнатыўнай адукацыі (Вальдорфскіх школ, школ Мантэсоры, Фрэнэ, Нейла, а таксама дыялогу культур, развіццёвага навучання, самавызначэння асобы і інш.).

***Асаблівую ўвагу варта звярнуць на неабходнасць дзяржаўнай падтрымкі і стымулявання ініцыятыў па адраджэнні такіх формаў, як гімназія, калегіум і да т.п., што аднаўляюць традыцыі беларускай нацыянальнай адукацыі. У аднаўленні традыцый мы бачым шлях да будучыні.***

*Красавік 1992 г.*

---

*Research group "National school of Belarus" (leader — the candidat of philosophical sciences M. Gusakovskiy) is working out the Conception of national scool. Theoretical principles of the Conception are proposed in this publication.*

Беларускі навукова-даследчы
інстытут адукацыі

Штомесячны навукова-тэарэтычны і
інфармацыйна-метадычны часопіс

Выдаецца са студзеня 1992 года

12 (12) 1992

# АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

## Образование и воспитание
*
## Education

Галоўны рэдактар
У.П.Пархоменка

Рэдакцыйная
калегія

Г. І. Васілеўская (адказны сакратар)
І. П. Граковіч
Н. Ю. Зайцава (намеснік
галоўнага рэдактара)
Г. Р. Клябанаў
М. І. Латыш
Д.А.Мілаванаў (мастацкі рэдактар)
Я. А. Пастушэнка
В. У. Протчанка
Л. А. Пергаменшчык
М. М. Плескацэвіч
Г. У. Швяцова
Л. М. Якавенка (першы намеснік
галоўнага рэдактара)

МІНСК
1992